выключную важнасць захавання чалавечага ў чалавеку, а таксама паказвае як стваральную, так і разбуральную моц стэрэатыпаў грамадства ў іх уздзеянні на асобу.

### Бібліяграфічныя спасылкі


1. Макарэвіч А. Чалавецтва ў сваім развіцці пайшло не па той дарозе... // Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мовы і літ. імя Я. Коласа і Я. Купалы. Мінск: Маст. літ., 2011. Т. 6 : Аповесці, 1994–1996. С. 498–526.

2. Шамякін І. П. Збор твораў: у 23 т. Мінск: Маст. літ., 2011. Т. 6 : Аповесці, 1994–1996.

3. Шамякін І. П. Збор твораў: у 23 т. Мінск: Маст. літ., 2011.  Т. 7 : Аповесці, 1996–1998.


## КАХАННЕ І ВЕРНАСЦЬ ПРАЗ ПРЫЗМУ ЧАСУ (НА МАТЭРЫЯЛЕ АПОВЕСЦІ ІВАНА ШАМЯКІНА «НЕПАЎТОРНАЯ ВЯСНА»)


**К. А. Урбановіч**

*Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы,*
*вул. Ажэшкі, 22, 230023, Гродна, Беларусь,*
*ksenyaurbanovich@gmail.com,*
*Навуковы кіраўнік: Садоўская А. С.,*
*загадчык кафедры беларускай філалогіі, дацэнт, кандыдат філалагічных навук*



Артыкул прысвечаны разгляду тэмы кахання ў аповесці «Непаўторная вясна» класіка беларускай літаратуры Івана Шамякіна. Сцвярджаецца, што непаўторная вясна павінна быць у жыцці кожнага чалавека. Гэта час, калі ўсе па-сапраўднаму шчаслівыя, як героі Івана Шамякіна ў сваю непаўторную вясну. Вясна, якая бывае ў каханні

людзей толькі аднойчы, але застаецца на ўсё жыццё – гэта вечная каштоўнасць, пра якую хочацца пісаць і гаварыць.

***Ключавыя словы***: Іван Шамякін; аповесць «Непаўторная вясна»; тэма кахання; праблема; ідэя.

У гэтым годзе адзначаецца 100-гадовы юбілей з дня нараджэння Івана Шамякіна. «Глыбокая плынь», «Сэрца на далоні», «Трывожнае шчасце», «Снежныя зімы»… Больш за дзясятак раманаў, шмат аповесцей, п’ес, апавяданняў, крытыка, публіцыстыка – такі абсяг жанравай палітры класіка.

Няма сумнення, што імя пісьменніка захаваецца ў памяці нашчадкаў, бо зробленае ім значна ўзбагаціла скарбніцу не толькі нацыянальнай, але і сусветнай культуры. Добра разумеючы вартасць літаратуры, Іван Шамякін дастаткова самакрытычна ставіўся да сябе і сваёй творчасці. Пісьменніка хвалявалі розныя тэмы, але пачатак яго творчасці быў звязаны з тэмай Вялікай Айчыннай вайны, бо наступствы яе класік адчуў на асабістым лёсе і лёсе сваіх блізкіх і родных. Тым не менш усе яго творы прасякнуты гуманнасцю. Асноўнае для яго – распаўсюджванне такіх вечных каштоўнасцей, як дабро, справядлівасць і праўда. Андрэй Макаёнак адзначаў, што «кожны раман ці аповесць Івана Шамякіна – гэта новае, свежае слова аб нашай рэчаіснасці, аб нашых праблемах, аб нашых людзях, раскрыццё маральных глыбін чалавечых душ, гэта і яго споведзь аб сваіх ідэалах, сваіх надзеях, сваіх радасцях і сваіх болях».

Тэма кахання вечная ў літаратуры. Да яе звярталася не адно пакаленне паэтаў і празаікаў розных эпох і перыядаў у гісторыі чалавецтва. На наш погляд, зусім не дзіўна, што дадзеная тэматыка разглядаецца шматлікімі майстрамі слова, і, заўважым, з вялікім задавальненнем. Тэма кахання хвалявала самых розных паэтаў, празаікаў, будзіла ў іх даўно перажытыя пачуцці, якія ў кожнага свае і жывуць у самых патаемных куточках душы. Безумоўна, каханне і натхняла на новыя шэдэўры. І ўзбударажаныя пісьменнікі апантана браліся за радочкі, якія сёння мы не

можам чытаць без захаплення і гонару за таленавітых землякоў. Да іх адносіцца і Іван Шамякін.

«Непаўторная вясна»… Для герояў аповесці гэта тая пара, якая бывае толькі аднойчы. Але нават за тое, што яна наведала хоць раз за жыццё, трэба дзякаваць лёсу. Для кожнага яна становіцца непаўторнай па асабістай прычыне. Нехта нарадзіўся вясной ці зрабіў першы ў жыцці крок, вызначыўся з будучым, прыняў важнае рашэнне, закахаўся ўпершыню… Сярод гэтага пераліку ў кожнага свой сімвал непаўторнай вясны. Свая прычына ўсмешкі яе першым баязлівым праменьчыкам, бялюсенькім пралескам і проста яе наступленню. Дарэчы, нават праз год ці праз шмат гадоў, пасля той самай непаўторнай вясны кожная вясна ўжо стане настальгічнай парой, сімвалічнай. Займаецца чалавек штодзённымі справамі – і нечакана прыемнае цяпло ўспамінаў: «А вось год назад у гэту пару…»

Чытала твор мінулай вясной. Пасля другога прачытання цяпер дзіўлюся, наколькі змяніўся мой аналіз учынкаў герояў, уражанне. Калі раней крытыкавала героя за пэўны ўчынак, то цяпер палічыла яго абдуманым і памяркоўным.

Светлая пара юнацтва, лепшыя гады, першыя высокія пачуцці, спробы самастойных крокаў па жыццёвым шляху, спатканні. Ці магчыма было ўявіць, што аповесць скончыцца падзеяй, якая закране самыя тонкія струны душы?

На працягу чытання аповесці цікава назіраць за развіццём адносін паміж галоўнымі героямі – Сашай Траянавай і Пятром Шапятовічам. Абое яшчэ зусім юныя, амаль дзеці. Гэта адлюстроўваецца і ў іх паводзінах: шмат мілай непасрэднасці, юнацкага максімалізму, эмацыянальнасці, душэўнай узнёсласці, змяняецца настрой, падзеі, поры года. Неператваралася толькі адно – каханне. Яно ў герояў такое рознае. На пачатку твора яно толькі ўзгаралася ў іх сэрцах. І пад уплывам падзей, недарэчнасцей, радасных хвілін успыхвала ўсё мацней. Напрыканцы аповесці можна ўжо назіраць дарослае, сталае пачуццё паміж закаханымі.

Якія толькі псіхалагічныя аспекты не закранаў аўтар. Прыгадаем пачатковую сцэну. Саша нядаўна скончыла

медыцынскае вучылішча і працуе фельчарам у вёсцы, а Пеця – студэнт тэхнікума, прыязджае да яе ў госці. Як жа яны чакалі гэтай сустрэчы, як уяўлялі, якія словы скажуць адно аднаму, як сустрэнуцца іх позіркі. Але ўсё змарнавала сарамлівасць, недасказанасць, адсутнасць вопыту, недарэчнасці з гаспадыняй, у якой Саша кватаравала. Хоць Пятру на ўсё гэта можна было б і не звярнуць асаблівай увагі, не быць такім гарачым і ўпартым. Разумеем яго эмацыянальнасць, але, напэўна, спадзяваліся, што, калі б Саша паклікала яго, ён вярнуўся б. Але гэтага не здарылася. Прынцыповасць.

Калі звярнуць увагу на характарыстыку Шапятовіча, то ўзнікае партрэт студэнта з цыратавым партфелем, напакаваным марамі, надзеямі, думкамі так поўна, як галава студэнта. На самай справе ў партфелі дзённікі з вершамі, прысвечанымі ёй – яго Сашы. Дзе б ён ні быў, чым бы ні быў заняты, у яго думках – яна. Пазней, адыходзячы ў армію, Пятро скажа: «Я ўсё роўна ўяўляю, што ты заўжды будзеш побач». Нават яго рэўнасцю да настаўніка Уладзіміра аўтар паказвае, як Пятро баіцца застацца без Сашы. Дзеля яе гатовы прайсці хоць мільярд кіламетраў. На шляху да яе і дарога яму ў радасць. Хоць у дарозе чаго толькі ні было: і загорнутыя ў газету ненадзейныя чаравікі, і мыццё ў лужы, каб прыйсці да каханай у належным выглядзе.

Тады, перад іх сустрэчамі, яму і захад сонца здаваўся прыгажэйшым, і самыя розныя пачуцці перапаўнялі сэрца. Боязнасць і радасць, надзеі і трывогі – усё змяшалася…

А што адчувае Саша? Чакае не менш за яго. Але таксама саромеецца і перад людзьмі, і перад гаспадыняй. Усё, здаецца, добра. Ды ўсё адначасова навалілася, быццам спробы, ці вытрывае іх пачуццё. І непрыхільнасць гаспадыні, і рэўнасць да маладога настаўніка робяць сваё. Пасля спрэчкі чакае яшчэ адно выпрабаванне моцы пачуццяў – сустрэча з Любай, даўняй знаёмай са школы.

І нарэшце каханне перамагло. Хутка Сашу чакала прыняцце сур’ёзнага рашэння. Гаспадыня, маці настаўніка ўгаворваюць дзяўчыну выйсці замуж за Уладзіміра. Гэта вымусіла задумацца над жыццём, прааналізаваць узаемаадносіны з Пецем. Але ўсё наладжваецца, абое

зрабілі правільны выбар. Прайшлі праз усе выпрабаванні на шляху кахання. Жэняцца.

Але ціхае шчасце аказалася кароткім. Незадоўга да вайны Пятра ўзрушваюць зорнай ноччу думкі: «Вось вайна ў Парыжы. А калі прыйдзе да нас і разлучыць нас і наша каханне, шчасце…» Думае і пазірае на Сашу. Не ведаў ён, як хутка думкі рэалізуюцца.

Расстанне не прымусіла чакаць. Прызвалі Пятра ў армію, пачалася вайна. Героі не паглядзелі на жыццё з боку цвярозага жыццёвага сэнсу, абдумана. Ажаніліся перад самым адыходам у армію ў неспакойны час. Папярэджваў бацька, што толькі дурні жэняцца перад арміяй. Але Пеця са шчырасцю і даверам кажа: «Інакш і быць не магло ў нас…Праўда, Сашок?»

Цяжкі час расстання, але, галоўнае, упэўненасць аднаго ў адным. Люстэркам сапраўдных пачуццяў герояў выступае нават прырода. У ёй і асенняя лёгкая трывожнасць у прыглушаных танах, і светлая вясновая абуджальнасць. Саша яшчэ падумала: «Чаму прызыў восенню – адно маркота, прызвалі б вясной, калі ўсё абуджаецца, квітнее, расцвітае, дыхае цяплом».

Непаўторная вясна павінна быць у жыцці кожнага чалавека. І сёння, і сто гадоў назад, і ў будучым. Гэта час, калі ўсе па-сапраўднаму шчаслівыя, як нашы героі ў сваю непаўторную вясну. Вясна, якая бывае ў каханні людзей толькі аднойчы, але застаецца на ўсё жыццё – гэта вечная каштоўнасць, пра якую хочацца пісаць і гаварыць.